Нельга забыць

# Людзі шукалі ратунку...

**Яшчэ адзін эпізод крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа даследуюць пошукавікі і супрацоўнікі пракуратуры Гомельскай вобласці ва ўрочышчы Воўчы Дуб у Жлобінскім раёне. Тут выяўлены астанкі мірных жыхароў — ахвяр карнай аперацыі часоў Вялікай Айчыннай вайны.**



Фота БелТА.

## ТРАГЕДЫЯ ВЯСКОЎЦАЎ

Вядома, што незадоўга да вызвалення раёна ад акупантаў у балоцістай мясцовасці ўрочышча хаваліся ад карнікаў жыхары вёскі Казімірава.

— Зімой 1943-1944 гадоў на гэтым участку раёна — поўнае нямецкае акружэнне, зусім побач лінія фронту. Людзі чакалі прыходу Чырвонай Арміі. Вядома, што ў канцы 1943 года каля сарака мясцовых жыхароў вёскі Казімірава пайшлі жыць у лес, каб схавацца ад адпраўкі на прымусовыя работы ў Германію, — распавяла **навуковы супрацоўнік Жлобінскага гісторыка-краязнаўчага музея, спецыяліст па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў Дар'я ЛУНІНА**. — Непадалёк ад гэтай мясцовасці базіраваліся партызаны. Вяскоўцы Казімірава — пераважна жанчыны з дзецьмі, моладзь — ладзілі ў лесе буданы. У сярэдзіне студзеня 1944-га фашысты выйшлі на сховішча. Людзей расстралялі і спалілі ў буданах.

Падрабязнасці тых страшных падзей, якія адбываліся на тэрыторыі Жлобінскага раёна, у сваім дзённіку апісаў франтавік Анатоль Дзяковіч. Хімік, выпускнік Саратаўскага ўніверсітэта, у 1941 годзе ён трапіў у нямецкае акружэнне, апынуўся ў палоне, але ўдалося збегчы, — ваяваў у складзе партызанскага атрада да злучэння з Чырвонай Арміяй у 1944 годзе. Пасля вызвалення Беларусі Анатоль Дзяковіч некаторы час жыў у Жлобіне — выконваў абавязкі старшыні выканкама гарсавета. Былы партызан у момант расправы над людзьмі ў Воўчым Дубе знаходзіўся прыкладна на гэтым участку. Аб тым, якая жудасная карціна фашысцкай расправы паўстала перад вачыма партызан, ён пакінуў падрабязныя запісы ў сваім дзённіку.

## З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Месца гібелі жыхароў Казімірава ўсе гэтыя гады берагла і людская памяць. У савецкі час людзі прыходзілі ва ўрочышча Воўчы Дуб, каб ушаноўваць памяць загінулых аднавяскоўцаў. Па зваротах мясцовых жыхароў у 2006 годзе на месца трагедыі выязджалі прадстаўнікі Жлобінскага гісторыка-краязнаўчага музея і ваенкамата. Сіламі сельсавета тады было ўсталявана надмагілле.

Грунтоўная работа па зборы інфармацыі аб гібелі казіміраўцаў у 1944 годзе стала весціся больш чым два гады таму, калі была распачата крымінальная справа па расследаванні генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны час Генеральнай пракуратурай Беларусі.

— Збіралі ўспаміны старажылаў вёскі, аналізавалі інфармацыю з крыніц фонду музея. Ёсць сведчанні, што хавалі ахвяр на месцы іх гібелі, бо было шмат спаленых касцявых астанкаў, якія людзі не маглі перанесці, — звяртае ўвагу Дар'я Луніна. — Дапамаглі ў пошукавай рабоце матэрыялы, якія доўгія гады збірала жыхарка Казімірава Інеса Тубалец — дачка жанчыны, што была непасрэднай сведкай тых падзей. Па ўспамінах сваёй маці і нешматлікіх вяскоўцаў, якім удалося тады выжыць, яна запісала прозвішчы забітых ва ўрочышчы вяскоўцаў. На сёння, на жаль, дакладна вядомы толькі 14 ахвяр.

## «ВОРАГ ДЗЕЙНІЧАЎ БЯЗЛІТАСНА»

Паводле папярэдняй інфармацыі, непасрэдна падчас студзеньскай карнай аперацыі на гэтым участку было знішчана больш за 100 мірных жыхароў.

— Фашысты праводзілі масавыя карныя аперацыі. Так, 14 студзеня была спалена вёска Ала Светлагорскага раёна. Акупанты працягвалі пошукавыя аперацыі і выйшлі на гэты ўчастак. Лазутчыкі пранiклі пад выглядам партызан. 16, 17, 18 і 19 студзеня тут адбывалася масавая расправа над мірнымі жыхарамі — у асноўным жанчынамі, старымі і дзецьмі. Яны спрабавалі схавацца ад выгану ў тылавыя раёны нямецкай арміі. Таксама немцы высылалі мірных жыхароў у парыцкія балоты, каб заразіць тыфам і выкарыстоўваць як бактэрыялагічную зброю супраць Чырвонай Арміі, — распавёў **выконваючы абавязкі пракурора Жлобінскага раёна Андрэй АНОШКА**.

Пошукавыя работы ва ўрочышчы Воўчы Дуб пачаліся на пачатку красавіка. Вайскоўцамі 52-га асобнага пошукавага спецыялізаванага батальёна Міністэрства абароны выяўлены пахаванні, а таксама знойдзены тыповы ланцужок грамадзянскіх зямлянак-буданоў.

— Карнікі часткова закідвалі зямлянкі гранатамі. Таксама першапачаткова пры разведцы мясцовасці былі выяўлены шматлікія гільзы ад нямецкіх вінтовак. Фактычна месца ачаплялася аўтаматчыкамі. Расстрэлы рабілі паліцаі, здраднікі радзімы, памагатыя фашыстаў. Яны стралялі ў тых, хто выходзіў адтуль. Вораг дзейнічаў бязлітасна, і наша задача захаваць аб'ектыўную гістарычную памяць, — падкрэсліў Андрэй Аношка.

## РАССЛЕДАВАННЕ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Дапамогу ў пошукавых работах ва ўрочышчы Воўчы Дуб аказваюць і навуковыя работнікі Жлобінскага гісторыка-краязнаўчага музея.

— Сёння мы працягваем аднаўляць звесткі аб перыядзе акупацыі нямецка-фашысцкімі захопнікамі Жлобінскага раёна. Актыўна супрацоўнічаем з пракуратурай, якая вядзе расследаванне крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа, — распавяла навуковы супрацоўнік Жлобінскага гісторыка-краязнаўчага музея Дар'я Луніна.

Усяго за час акупацыі ў раёне было спалена 117 вёсак. Сем з іх — Браткі, Грушка, Залессе, Замосце, Краснаўка, Кастрычнік, Залужжа — пасля вайны так і не аднавіліся. Зямля, сабраная на месцах пажарышчаў, прадстаўлена ў экспазіцыі музея.

Як нагадала гісторык, увосень 1943 года, калі савецкія войскі рыхтаваліся да фарсіравання Дняпра, у Жлобінскім раёне фашысты актыўна праводзілі карныя акцыі. Трагедыі не абмінулі пасёлак Верны, вёску Цупер. На пачатку 1944 года, калі частка раёна была вызвалена, карнікі не шкадавалі населеныя пункты Кароткавіцкага сельсавета. Амаль цалкам быў знішчаны цэнтр — вёска Кароткавічы. Частка жыхароў гэтага населенага пункта шукалі паратунку, але загінулі ў трагічна вядомай Але Парыцкага (цяпер Светлагорскага) раёна. Як вядома, 14 студзеня падчас зверскай расправы нацыстаў пакутніцкую смерць у Але прынялі 1758 мірных жыхароў, у тым ліку 508 жанчын і 950 дзяцей.

— Непадалёку ад урочышча Воўчы Дуб, дзе вядуцца пошукавыя работы, у лесе побач з вёскай Баршчоўка знаходзіцца пахаванне гэтага ж ваеннага перыяду. Пахаваны забітыя фашыстамі дзве мясцовыя настаўніцы, іх дзеці і васямнаццацігадовая дзяўчына. На гэтым месцы стаіць помнік, усталяваны пасля вайны бацькам адной з настаўніц разам са школьнікамі. Мясцовыя жыхары шчыра ўдзячны за захаванне памяці аб гэтых ахвярах вайны. Таму вельмі важна працягваць маштабную архіўна-даследчую работу, устанаўліваць новыя факты, раней невядомыя месцы пахаванняў, — перакананa жлобінскі гісторык.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# АДРАСЫ ВАЕННАЙ ПАМЯЦІ

**Вайна не скончана, пакуль не будзе пахаваны апошні загінулы салдат. Вялікая Айчынная вайна займае асаблівае месца ў памяці беларускага народа. І асобнай старонкай у гэтай гісторыі з'яўляецца генацыд нашага народа. Пра тое, што ў сучаснай Беларусі робяць для ўвекавечвання памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны, як захоўваць памяць пра кожнага, хто загінуў у барацьбе за Радзіму, якія меры прымаюцца ў нашай краіне для абароны Перамогі ад спроб фальсіфікацый, пагаварылі прадстаўнікі беларускіх выдавецтваў на сустрэчы з журналістамі. І прэзентавалі шэраг кніжных навінак на ваенную тэматыку.**

— Мы не маглі абысці ўвагай 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, і гэтая тэма ключавая для нас і ва ўсе мінулыя гады. Летась у медыйным полі вельмі шмат увагі было аддадзена ёй, таму што першыя раёны Беларусі вызвалілі пачынаючы якраз з другой паловы 1943 года. А напярэдадзе ў нас 80-годдзе Вялікай Перамогі ў 2025 годзе. Таму парадак дня, тэматыка, кірункі і публіцыстычных, і мастацкіх кніг, якія запланаваны ці ўжо выйшлі ў нашым выдавецтве, безумоўна, звязаны з ваеннай і гісторыка-патрыятычнай тэмай, — адзначыў **дырэктар — галоўны рэдактар РВУ «Выдавецкі дом «Звязда», старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь КАРЛЮКЕВІЧ**. — У нас ёсць шэраг аўтараў, з якімі мы пачынаем рэалізацыю доўгатэрміновых праектаў. Шмат сёння гаворыцца пра генацыд беларускага народа. І велізарная работа праведзена выдавецтвам «Беларусь» і іншымі выдавецкімі структурамі нашай краіны ў гэтым кірунку. А мы вырашылі знайсці сваё мастацка-дакументальнае адлюстраванне гэтай тэмы і расказаць пра спаленыя вёскі. Адна з нашых кніг прысвечана вёсцы Драмлёва Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Яе аўтарам стаў журналіст, пісьменнік, краязнавец Анатоль Бензярук. Называецца яна «Галавасек», менавіта ў гэтае праваслаўнае свята вёску знішчылі разам з яе жыхарамі. Зараз у нас выходзіць фактычна працяг гэтага праекта. Днямі чакаем з друкарні кнігу «Беразянка» ад вядомага аўтара, публіцыста, члена Саюза пісьменнікаў Аляксандра Плавінскага і навукоўца Андрэя Шавеля. Гэта аповед пра вёску, якая знаходзіцца недалёка ад Мінска ў Пухавіцкім раёне. У выданні чытач знойдзе шмат дакументаў і разам з тым напружаны, эмацыянальны аповед пра ўсе падзеі, якія звязаны з трагедыяй гэтага паселішча. Тэма вогненных вёсак знаходзіць сваё месца і на старонках многіх перыядычных выданняў. Так яна атрымлівае новае асэнсаванне, і ў ёй адкрываюцца новыя факты, новыя гісторыі, новыя сведчанні.

Таксама напярэдадні Дня Перамогі выйдзе кніга Мікалая Чаргінца «Аперацыя «Кроў». Вядомы твор народнага пісьменніка Беларусі на тэму Вялікай Айчыннай вайны выдаецца ўжо не першы раз, але інтарэс з боку бібліятэк і шараговага чытача да яго застаецца і сёння. Яшчэ варта згадаць кнігу Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі «Званоў перазвон», прысвечаную мастацкаму асвятленню хатынскай трагедыі. А вось у кнізе «Ведаем, ганарымся» Ірыны Аўсеп'ян сабраны нарысы пра знакамітых асоб нашай краіны (асветнікаў, пісьменнікаў, дзеячаў культуры), якія былі ўдзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны. Заслугоўвае ўвагі чытачоў і кніга Мікалая Барысенкі «Буйніцкае поле: «Застацца і памерці». Як адзначыў Алесь Карлюкевіч, ёсць верагоднасць, што кніга атрымае працяг, «бо хацелася б паказаць і іншыя адрасы такой драматычнай памяці народа Беларусі і савецкага народа на нашай тэрыторыі ў розныя ваенныя гады».

Таксама ў Выдавецкага дома «Звязда» склалася добрае супрацоўніцтва з вядомым расійскім пісьменнікам Мікалаем Чаркашыным, які родам з Ваўкавыска. Ім напісаны цэлы цыкл раманаў пра падзеі 1941 года ў Беларусі. Тут ужо паспелі выдаць кнігі «Брэсцкія вароты» і «Генералы 1941 года». І рыхтуюцца да выхаду яшчэ два яго раманы. Акрамя гэтага, вядзецца работа над шэрагам публіцыстычных выданняў, дзе знойдуць адлюстраванне і падзеі Вялікай Айчыннай вайны, і сённяшняе стаўленне грамадства да падзей 1941—1945 гадоў.

У сваю чаргу **намеснік дырэктара выдавецтва «Мастацкая літаратура» Віктар ШНІП** скіраваў увагу прысутных на шэраг іх выданняў, прысвечаных ваеннай тэме:

— Галоўная кніга нашага выдавецтва, якая выйшла да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, — гэта «За цябе, Беларусь!». У ёй паказана хроніка вызвалення з 1941 да 1944 года. Гэта сумесны праект выдавецтва «Мастацкая літаратура» і Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Кніга адметная тым, што ў ёй можна знайсці храналогію падзей таго часу на тэрыторыі Беларусі. Багатае выданне на фотадакументы, а таксама як аўтар-укладальнік кнігі я напоўніў яе творамі беларускіх пісьменнікаў-франтавікоў (Максіма Танка, Пімена Панчанкі, Аркадзя Куляшова, Івана Шамякіна і многіх іншых), запісамі з іх дзённікаў. Кніга гэта не толькі цікавая як дакумент, сведчанне мінулага, але і як крыніца, якая паспрыяе выхаванню духу патрыятызму ў нашага маладога пакалення.

Да важных і цікавых выданняў, якія ўбачылі свет у «Мастацкай літаратуры», варта аднесці і перавыданне кнігі «Ніколі не забудзем» з успамінамі дзяцей вайны, раман Івана Чыгрынава «Плач перапёлкі» з серыі «Народная бібліятэка», кнігу з творамі «Хатынская аповесць» Алеся Адамовіча і «Апошнія і першыя» Барыса Сачанкі ў серыі «Беларуская аповесць». Дарэчы, шмат тэматычных матэрыялаў да 80-годдзя вызвалення Беларусі можна знайсці таксама ў часопісах выдавецтва «Нёман», «Полымя», «Маладосць».

А вось у выдавецтве «Беларусь» свет убачылі такія выданні, як «Дзеці вайны: іх дзяцінства скончылася летам 1941 года» Ільі Караблікава. І гэта супрацоўніцтва плануюць працягваць. Серыя «Беларуская энцыклапедыя» цяпер папоўнілася кнігай «Партызанскія парады і святы на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны», яна будзе карыснай для школьнікаў. У хуткім часе выдавецтва плануе таксама прэзентаваць міжнародны праект «Сыны Башкартастана ў баях за Беларусь».

— Тэма Вялікай Айчыннай вайны для нашага выдавецтва з'яўляецца цэнтральнай. Увесь час мы выдаём кнігі, якія звязаны з гэтай тэмай. Хоць і здаецца, што столькі часу прайшло і ўжо не павінна быць белых плям у ёй, аднак кожная новая кніга — гэта чарговы доказ тых страшных падзей, — дзеліцца **загадчык аддзела рэкламы выдавецтва «Беларусь» Анжэла САДОЎСКАЯ**. — Адзін з праектаў, які пацвярджае, што ў гэтай тэме яшчэ шмат нязведанага, які раскрывае нам гераізм нашых людзей і страшныя злачынствы нацыстаў, — «Генацыд беларускага народа». Яго мы ажыццяўляем сумесна з Генеральнай пракуратурай. Праект гэты атрымаў вялікі рэзананс і ўжо стаў вядомы. І апошняя кніга, «Генацыд беларускага народа. Карніцкія аперацыі», якая выйшла ў нас напрыканцы мінулага года, як і дзве папярэднія, «Генацыд беларускага народа. Лагеры смерці» і «Генацыд беларускага народа», атрымала вялікі водгук у чытацкай аўдыторыі.

Прэзентавалі на сустрэчы таксама кнігу «Партызаны Беларусі». І, як адзначыў яе **аўтар-укладальнік Алег УСАЧОЎ, журналіст выдавецкага дома «Беларусь сегодня»,** гэта сапраўдная энцыклапедыя партызанскага жыцця:

— У гэтай кнізе сабраны звесткі як пра камандзіраў атрадаў, так і пра звычайных партызан. Усе разам кавалі нашу агульную Перамогу, бо ўсе мы непарыўна звязаны з нашымі продкамі і з нашай гісторыяй. І гэтая кніга — даніна памяці ўсім, хто змагаўся за вызваленне Беларусі.

**Алена ДРАПКО.**

# Акцэнт — на сацыяльнай падтрымцы

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Намеснік міністра паведаміла, што з пачатку бягучага года сацыяльныя службы, валанцёры, грамадскія аб'яднанні, навучэнцы і моладзь пайшлі да ветэранаў, каб абследаваць умовы іх пражывання, выявіць патрэбы і максімальна іх закрыць. Такое абследаванне прайшло па ўсёй краіне. У выніку 400 чалавек атрымалі дадатковыя віды падтрымкі: сацыяльныя паслугі, тэхнічныя сродкі сацыяльнай рэабілітацыі, прыборку прыдамавой тэрыторыі.

— Гэты маніторынг пастаўлены на штомесячную аснову, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ажыццяўляе штомесячны кантроль задавальнення запытаў паважаных ветэранаў, — падкрэсліла Марына Арцёменка.

Сёння меры сацыяльнай падтрымкі ахопліваюць усе сферы жыцця ветэранаў і аказваюцца па самых розных напрамках. У сферы аховы здароўя гэта бясплатныя забеспячэнне лекавымі сродкамі і зубапратэзаванне, штогадовае бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне. Паколькі з улікам узросту ветэранаў не ўсе могуць паехаць у санаторый, ім выплачваецца грашовая кампенсацыя за пуцёўку — гэта 10 базавых велічынь (каля 400 рублёў штогод).

Таксама забяспечваецца бясплатны праезд на ўсіх відах гарадскога і прыгараднага транспарту, скідка за аплату жыллёва-камунальных паслуг. У сферы пенсіённага забеспячэння ўстаноўлены шэраг павышэнняў, узроставых даплат, надбавак на догляд. Удзельнікам вайны і інвалідам з 1 мая такія даплаты да асноўнага памеру пенсіі складаюць ад 420 да 620 рублёў. А іншым катэгорыям ветэранаў і былых вязняў — больш за 260 рублёў.

## ВЫПЛАТЫ АТРЫМАЛІ 8400 ЧАЛАВЕК

Вельмі важная мера сацыяльнай падтрымкі — выплата матэрыяльнай дапамогі. Указам кіраўніка дзяржавы гэта адбываецца з 2021 года. Сёлета, улічваючы юбілейныя даты, памер матэрыяльнай дапамогі для ветэранаў павялічаны ў два разы і склаў ад дзвюх да чатырох тысяч рублёў. Асобам, якія пацярпелі ад наступстваў вайны, выплацілі тысячу рублёў. Такую дапамогу да Дня Перамогі атрымалі 8400 чалавек на агульную суму 10,5 мільёна рублёў.



— Выплаты завяршылі датэрмінова, работа была арганізавана выдатна ва ўсіх рэгіёнах. Трэба адзначыць, што гэтыя выплаты суправаджаліся ўрачыстымі мерапрыемствамі, да якіх далучылася наша моладзь, грамадскія аб'яднанні, навучэнцы, і для ветэранаў мы стварылі свята, бо для пажылых людзей важнае найперш гэта кантактаванне. А для моладзі гэта добры ўрок, запаветы якога запомніш на ўсё жыццё, — падкрэсліла Марына Арцёменка.

Што датычыцца сацыяльнага абслугоўвання, то сёння ўсе, хто маюць патрэбу ў пастаяннай пабочнай дапамозе, яе атрымліваюць, адзначыла намеснік міністра. У прыватнасці, у сацыяльных пансіянатах сёння жывуць 144 ветэраны і былыя вязні фашызму, сацыяльныя паслугі дома атрымліваюць 1300 чалавек, сваяцкі догляд з выплатай дапамогі ажыццяўляецца ў адносінах 335 чалавек. У цэлым на сістэму сацыяльнага абслугоўвання ў бягучым годзе будзе затрачана каля сямі мільёнаў рублёў. Калі ж улічваць пакет сацыяльных ільгот для ветэранаў вайны і асоб, якія пацярпелі ад яе наступстваў, то гэта каля 30 мільёнаў рублёў штогод.

## ДАДАТКОВЫЯ ГАРАНТЫІ

Марына Арцёменка звярнула ўвагу, што сёння не толькі захоўваюцца гэтыя віды дапамогі, але і ўносяцца новыя заканадаўчыя ініцыятывы па павышэнні ўзроўню падтрымкі асобных катэгорый ветэранаў. У прыватнасці, у першым чытанні 17 красавіка прыняты праект закона «Аб ветэранах».

— Улічваючы, што ў нас прыняты Закон «Аб генацыдзе беларускага народа», той факт, што ўсё менш застаецца ветэранаў, для былых вязняў фашызму будуць устаноўлены дадатковыя гарантыі ў сферы аховы здароўя. Гэта бясплатнае забеспячэнне лекавымі сродкамі, тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі, бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне, бясплатны выраб і рамонт зубных пратэзаў, — паведаміла намеснік міністра.

А для асобных катэгорый ветэранаў, такіх як ветэраны Вялікай Айчыннай вайны з ліку асоб, узнагароджаных ордэнамі і медалямі СССР за бездакорную воінскую службу ў тыле (ваеннаслужачых тылу), і самаадданую працу (працаўнік тылу) будзе павялічаны ўзровень сацыяльнай падтрымкі. У прыватнасці, ваеннаслужачыя тылу прыраўноўваюцца да ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, і гэта абумоўлена ў тым ліку заканадаўствам Расійскай Федэрацыі, дзе яны маюць такі статус. Для іх будзе ўстаноўлена павышэнне памеру пенсіі з 50 да 250 % мінімальнай пенсіі па ўзросце (з 55 да 260 рублёў). Таксама будзе выдзелена матэрыяльная дапамога на аздараўленне і павялічыцца памер матэрыяльнай дапамогі да Дня Перамогі. Для працаўнікоў тылу будзе павялічаны памер прадугледжанага павышэння да пенсіі ў два разы — з 50 да 100 % мінімальнай пенсіі па ўзросце (да 110 рублёў).

Працягваючы тэму сацыяльнай абароны ветэранаў, **старшыня Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання ветэранаў дэпутат Палаты прадстаўнікоў Іван ГАРДЗЕЙЧЫК** адзначыў, што ў пачатку мая пабываў у Маскве, дзе сабраліся кіраўнікі ветэранскіх арганізацый васьмі дзяржаў, у тым ліку Латвіі і Эстоніі.

— У Беларусі цудоўныя адносіны да ветэранаў. Тое, што я пачуў ад сваіх калег з іншых краін, не радуе, наадварот, становіцца вельмі сумна, — дадаў Іван Гардзейчык.

Ён удакладніў, што сёння ветэраны ўцягнуты ў дзейнасць ветэранскіх арганізацый, патрыятычнае выхаванне моладзі, а таксама ўдзельнічаюць ва ўсіх значных дзяржаўных мерапрыемствах. У прыватнасці, дэлегатамі Усебеларускага народнага сходу стала 80 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны.

## ФОТАЗОНЫ, САЛДАЦКАЯ КАША І КОНКУРСЫ

Як паведаміў **начальнік 2-га аддзела ўпраўлення інфармацыі Міністэрства абароны Аляксандр КІСЕЛЬ**, традыцыйна гэтымі днямі беларусы змогуць пабачыць беларускую армію — не падчас выканання вучэбна-баявых задач, а сярод галоўных арганізатараў і ўдзельнікаў святочных мерапрыемстваў.

— У нас вялікая ўвага аддаецца адраснаму віншаванню ветэранаў. Ва ўсіх рэгіёнах краіны ваеннаслужачыя далучыліся да гэтай акцыі. Улічваючы паважаны ўзрост ветэранаў, выкарыстоўваюцца нестандартныя формы віншаванняў. Акрамя кветак і падарункаў, імкнёмся стварыць атмасферу свята: у дварах дамоў, дзе жывуць ветэраны, ваеннаслужачыя праходзяць урачыстымі маршамі, ваенныя аркестры выконваць музычныя кампазіцыі ваенных гадоў, армейскія артысты ставяць творчыя нумары, — расказаў Аляксандр Кісель.

Акрамя таго, напярэдадні Дня Перамогі ветэраны ўзнагароджваюцца юбілейнымі медалямі «80 гадоў вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў». Учора ў музеі Вялікай Айчыннай вайны падчас урачыстай цырымоніі такія медалі ўручыў міністр абароны Віктар Хрэнін.

У Дзень Перамогі ваеннаслужачыя таксама возьмуць удзел ва ўрачыстых мерапрыемствах ва ўсіх абласных цэнтрах і іншых населеных пунктах. У Мінску 9 мая будзе арганізавана работа дзесяці тэматычных пляцовак ва ўсіх раёнах горада, дзе можна пазнаёміцца з сучаснымі ўзорамі ваеннай і спецыяльнай тэхнікі, новага адзення і экіпіроўкі, будуць працаваць фотазоны і трэнажоры, пункты прафарыентацыі. Ахвотныя змогуць паўдзельнічаць у ваенных і спартыўных конкурсах, выставы музейных экспанатаў. З унікальнымі праграмамі выступяць ваенныя кінолагі са службовымі сабакамі, сваё майстэрства прадэманструюць ваенныя розных родаў войск і сіл спецыяльных аперацый. Творчыя калектывы пакажуць свае музычныя нумары, а ваенныя пачастуюць традыцыйнай салдацкай кашай.

**Алена КРАВЕЦ.**

Надвор'е

# Накрые хваля холаду

І нават у маі бывае так, што цяпло адступае. Добра, што кароткачасова

**Сёлета кантрасны характар надвор'я быў спачатку ў красавіку, а цяпер ужо і ў маі. У эпоху глабальнага пацяплення такія сюрпрызы могуць быць і ў пачатку чэрвеня, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



У аўторак умовы надвор'я ў Беларусі будуць вызначаць атмасферныя франты ад цыклону, цэнтр якога будзе перамяшчацца з тэрыторыі нашай краіны ва ўсходнім напрамку. Днём на заходнія раёны распаўсюдзіцца вобласць павышанага атмасфернага ціску, сфарміраваная ў халоднай паветранай масе. Чакаецца воблачна, днём з праясненнямі. Часам пройдуць дажджы, месцамі па поўначы краіны магчымы мокры снег. Удзень пераважна ва ўсходняй палове краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. У начныя і ранішнія гадзіны месцамі па краіне будзе згушчацца слабы туман. Вецер уначы пераменны, удзень паўночны, паўночна-заходні парывісты, удзень месцамі моцны парывісты. Тэмпература паветра днём ад 7 цяпла да 13 градусаў, па поўдні краіны — да 16 градусаў. Атмасферны ціск ноччу істотна не зменіцца, днём будзе інтэнсіўна расці.

А далей нас чакае хваля холаду. Бо 8 і 9 мая ўмовы надвор'я будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, якая сфарміравалася ў халоднай паветранай масе паўночных шырот. Чакаецца пераменная воблачнасць.

У сераду чакаецца адсутнасць ападкаў. Вецер паўночнай чвэрці ўмераны. Ноччу на большай частцы тэрыторыі рэспублікі чакаюцца замаразкі ад нуля да мінус 3 градусаў, месцамі мінімальная тэмпература паветра будзе крыху вышэйшай — 1—3 цяпла. Сонечнае надвор'е днём павысіць тэмпературу да плюс 8 градусаў па паўночным усходзе, а па паўднёвым захадзе краіны чакаецца да 17 цяпла.

Досыць холадна ноччу будзе і 9 мая. У гэты дзень надвор'е чакаецца пераважна без ападкаў. Вецер пераменных напрамкаў умераны. Уначы на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца замаразкі ад нуля градусаў да мінус 3, па паўночным усходзе ў асобных раёнах — да мінус 5.

Замаразкі абяцаюць не ўсюды, бо месцамі мінімальная тэмпература паветра будзе вагацца ў межах 1—5 цяпла. Дзённая тэмпература паветра ўсталюецца ад плюс 8 градусаў па паўночным усходзе да 18 цяпла па паўднёвым захадзе краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**